УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Філалагічны факультэт
Кафедра беларускай літаратуры і культуры

# УСХОДНІЯ ВЕРШАВАНЫЯ ФОРМЫ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ: АСАБЛІВАСЦІ РЭЦЭПЦЫІ

Дыпломная работа
студэнткі 41 групы
4 курса спецыяльнасці
«Беларуская мова і літаратура»
дзённай формы
атрымання адукацыі
__________Дубавай
Алены Васільеўны

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных
навук, дацэнт
__________Н.В. Заяц

Дапушчана да абароны

Загадчык кафедры ________ Гоўзіч І.М.

Пратакол № 9 ад 19.04.2016 г.

Абаронена 22 чэрвеня 2016 г.
з адзнакай «10 (дзесяць)»

Мінск, 2016

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner

## РЭФЕРАТ

Дубава Алена Васільеўна

### Усходнія вершаваныя формы ў сучаснай беларускай паэзіі: асаблівасці рэцэпцыі

**Ключавыя словы:** паэзія, лірыка, танка, хоку, рубаі, газель, версэт, вершаказ, пераклад, усходнія вершаваныя формы, жанр.

**Аб'ект даследавання** – усходнія вершаваныя формы ў сучаснай беларускай паэзіі.

**Прадмет даследавання** – асаблівасці рэцэпцыі і трансфармацыі ўсходніх вершаваных форм у сучаснай беларускай паэзіі.

**Мэта работы** – даследаваць адметнасць інтэрпрэтацыі ўсходніх вершаваных форм у беларускай версіфікацыі.

**Метадалагічную базу** дыпломнай работы складаюць напрацоўкі ў галіне гісторыі і тэорыі літаратуры, мастацкага перакладу, крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы айчынных і расійскіх даследчыкаў. Выкарыстоўваюцца метад крытычнага аналізу навуковай літаратуры, асноўныя прыёмы параўнальна-гістарычнага, тыпалагічнага і герменеўтычнага метадаў.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў** заключаецца ў паглыбленні, удакладненні і сістэматызацыі тэарэтычных уяўленняў пра класічныя ўсходнія вершаваныя формы: хоку, танка, рубаі, газель. Упершыню праведзены параўнальны аналіз рускіх і беларускіх мастацкіх перакладаў усходніх вершаваных форм. Даследаванне арыгінальных вершаваных мініяцюр сучасных беларускіх паэтаў дазваляе прадставіць далейшыя напрамкі развіцця беларускай версіфікацыі.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы і асноўныя палажэнні даследавання могуць знайсці прымяненне ў лекцыях па розных вучэбных дысцыплінах: "Уводзіны ў літаратуразнаўства", "Тэорыя літаратуры", "Гісторыя беларускай літаратуры", "Сучасны літаратурны працэс", пры распрацоўцы спецкурсаў, семінараў, урокаў і факультатыўных заняткаў па тэмах "Вершаскладанне" і "Сучасная беларуская паэзія". Матэрыялы дыпломнай работы могуць быць выкарыстаны студэнтамі-філолагамі пры пры напісанні дыпломных і курсавых работ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner